# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

**НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС**

**11 (292) лістапад 2023 год**

Выдаецца са студзеня 1993 г.

Выходзіць 12 разоў у год (з ліпеня 2003 г.)

*Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 1221 ад 8 лютага 2010 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

Адрас рэдакцыі: 220073, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 25, кабінет 408.

Тэлефон: 8 (017) 270-47-20.

Час працы: 8.30 — 17.00 (пн — пт).

http://www.aiv.by;
e-mail: bhc.redaktor2022@gmail.com

РУП "Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне".

220070, г. Мінск, вул. Будзённага, 21.

Тэлефон: 8 (017) 257-91-49; e-mail: aiv@aiv.by

Выхад у свет 30.11.2023 г. Афсетны друк.

Фармат 60×84 1/8.

Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11,2.

Наклад 380 асобнікаў. Заказ № 1340.

Цана свабодная.

Надрукаваны ў вытворчым даччыным унітарным прадпрыемстве "Друкарня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі". ЛП 02330/54 ад 12.08.2013 г. 220030, г. Мінск, пл. Свабоды, 23—103.


Да ведама аўтараў!

За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункта гледжання аўтараў.

Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя.

Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш за 12 старонак (кегль 14, праз 1,5 інтэрвалу). Неабходна ў допісах паведамляць свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова ідэнтыфікацыйны нумар), адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.


**Падпісвайцеся на тэлеграм-канал выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"!**

aivbooks



## Заснавальнікі:

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне", дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**





**Галоўны рэдактар**
**Аляксандр Аляксандравіч КОРЗЮК,**
**кандыдат педагагічных навук, дацэнт**

## Рэдакцыйная калегія:

**Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Юлія Захарына, Аляксандр Каваленя, Аляксандр Каханоўскі, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Аляксандр Кушнярэвіч, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Ігар Марзалюк, Леанід Мартынаў, Мікалай Мязга, Аляксандр Радзькоў, Аляксандр Смолік, Алена Снапкова, Алег Субоцін, Ганна Торхава, Эдмунд Ярмусік.**

## Рэдакцыйная рада:

**Іван Багдановіч, Сымон Барыс, Аляксандр Вабішчэвіч, Іван Варывончык (старшыня), Венера Вspecified, Людміла Гаўрылавец, Сяргей Герасімовіч, Валянціна Гінчук, Аляксандр Гужалоўскі, Галіна Давідоўская, Віктар Жук, Вольга Жураўлевіч, Валянціна Капанёва, Алеся Корсак, Віталь Крывуць, Надзея Кушнер, Вячаслаў Лазіцкі, Вадзім Лакіза, Сяргей Новікаў, Сяргей Паноў, Алег Слука, Сяргей Ходзін, Алег Яноўскі.**

## Рэдакцыя:

**намеснік галоўнага рэдактара — Наталля Матусевіч,**
**рэдактар аддзела — Ілля Касько,**
**вядучы тэхнічны рэдактар,**
**мастацкае афармленне — Ірына Селяменева,**
**вядучы літаратурны рэдактар — Людміла Шчэрба.**



У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2005 г. № 101 (у рэдакцыі загада Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 21 снежня 2022 г. № 455) "Беларускі гістарычны часопіс" уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных, юрыдычных навуках, мастацтвазнаўстве і культуралогіі.

З лістапада 2022 г. надрукаваныя ў часопісе артыкулы размяшчаюцца ў расійскай навуковай электроннай бібліятэцы eLibrary, інтэграванай з Расійскім індэксам навуковага цытавання (РИНЦ).

**Індэксы для індывідуальнай падпіскі — 74830,**
**для ведамаснай — 748302,**
**на сайце belpressa.by — 679.**



© "Беларускі гістарычны часопіс", 2023.

# ЗМЕСТ

**2023 — ГОД МІРУ І СТВАРЭННЯ**

*Круглы стол “Да 100-годдзя ўтварэння Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі”*


**Прывітальныя словы ўдзельнікам круглага стала** 3

ГІСТОРЫЯ ПАРТЫЙ І РУХАЎ

**Аляксандр Горны** — **Феномен КПЗБ: сучасны погляд на гісторыю Заходняй Беларусі** 8

**Бібліяграфія навуковых артыкулаў і метадычных матэрыялаў па гісторыі Заходняй Беларусі (1921—1939), надрукаваных у “Беларускім гістарычным часопісе” ў 1994—2022 гг.** 8, 35, 71

**Аляксандр Савіч** — **Сялянскі фактар у дзейнасці Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі** 9

ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

**Аляксей Загідулін** — **Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (1923—1938 гг.) у адлюстраванні замежнай гістарыяграфіі** 17

ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

**Аляксандр Горны** — **Прыбудова КПЗБ, ці Рэха Грамады: дзейнасць Цэнтра нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі (1932—1936 гг.)** 23

ЭКАНАМІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

**Сяргей Траццяк** — **Праекты індустрыялізацыі і комплекснага развіцця Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг.** 32

**Віталь Гарматны** — **Сацыяльна-эканамічнае развіццё гміны Міжлессе Пружанскага павета Палескага ваяводства ў 1921—1939 гг.** 36

САЦЫЯЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

**Вольга Ананька** — **Дзейнасць амбулаторных устаноў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг.** 40

**Алена Пашковіч** — **Голад на Віленшчыне ў канцы 1920-х гг. і ўдзел палітычных сіл у яго ліквідацыі** 46

ГІСТОРЫЯ АДУКАЦЫІ

**Кірыл Ананька** — **Культурна-асветніцкае жыццё беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.)** 52

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

**Вольга Наважылава** — **“Выкуем долю ўласнай рукою...”** 58

МЕТАДЫКА. ВОПЫТ

**Аксана Колтан** — **Гістарычная асоба як “месца памяці”: магчымасці прыёму персаніфікацыі** 64

**Марына Горная** — **Заходняя Беларусь у складзе Польшчы** *(Гісторыя Беларусі, IX клас)* 68

**Содержание/Summary** 72


***Да ведама аўтараў.*** *Дасылаючы матэрыялы для публікацыі ў нашым часопісе, аўтары тым самым даюць згоду на апрацоўку персанальных дадзеных, перадаюць выдаўцу невыключныя маёмасныя правы на ўзнаўленне, распаўсюджванне, давядзенне да ўсеагульнага ведама і іншыя магчымыя спосабы выкарыстання твора без абмежавання тэрыторыі распаўсюджвання (у тым ліку ў электроннай версіі часопіса), а таксама на рэдагаванне і скарачэнне матэрыялу па меркаванні рэдакцыі. Папярэджваем аб прававой абароне аўтарскіх правоў на змешчаныя матэрыялы. Перадрук магчымы толькі з дазволу рэдакцыі з абавязковай спасылкай на “Беларускі гістарычны часопіс”.*

УДК 94(476)

**Аляксандр ГОРНЫ**

*Кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, кіраўнік Цэнтра даследавання дыяспар і замежнага беларусазнаўства Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.*
*Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя беларускага нацыянальнага руху, палітычная гісторыя Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, гісторыя беларускай дыяспары, гісторыя Праваслаўнай царквы ў XX ст.*
*Аўтар каля 150 навуковых і навукова-папулярных публікацый. Адзін з аўтараў манаграфій "Рижский мир в судьбе белорусского народа" (Минск, 2014), "История белорусской государственности" (Т. 3. Минск, 2018). Рэдактар пяці зборнікаў дакументаў па гісторыі беларускага нацыянальнага руху і гісторыі Праваслаўнай царквы.*



# Прыбудова КПЗБ, ці Рэха Грамады:
## *дзейнасць Цэнтра нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі (1932—1936 гг.)*

**У артыкуле на аснове раней не вывучаных архіўных дакументаў і іншых матэрыялаў раскрываецца малавядомы аспект міжваеннай гісторыі — дзейнасць Цэнтра нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Дадзеная арганізацыя была створана маладымі беларускімі актывістамі з мэтай аформіць легальны левырадыкальны рух у Заходняй Беларусі пад патранатам КПЗБ. Важным накірункам дзейнасці гэтай арганізацыі з'яўлялася выданне газет і часопісаў, такіх як "Беларуская газэта", "Літаратурная старонка" і "Асва", якія бясплатна распаўсюджваліся ў заходнебеларускіх гарадах і вёсках. Актыў Цэнтра жадаў пашырыць беларускую культурную прастору ва ўмовах паланізацыі і даць магчымасць рэалізавацца новым літаратарам і культурным работнікам. Судовы працэс над дзеячамі Цэнтра стаў апошнім маштабным судом над беларускімі актывістамі ў міжваеннай Польшчы.**

**Ключавыя словы:** *беларускі нацыянальны рух, Польшча, Заходняя Беларусь, КПЗБ, нацыянальныя працэсы*

У міжваеннай Польскай дзяржаве беларускі нацыянальны рух разгортваў сваю дзейнасць з дапамогай легальных і нелегальных сродкаў барацьбы. Апошнія ў асноўным выкарыстоўвалі левырадыкальныя палітычныя сілы, у прыватнасці Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ). У польскім прававым полі гэтая арганізацыя лічылася антыдзяржаўнай, а яе актывісты праводзілі сваю працу ў падпольных умовах, рызыкуючы быць арыштаванымі паліцыяй. Гэта прымушала многіх партыйных лідараў выпрацоўваць больш гнуткую тактыку дзейнасці і скарыстоўваць законныя рэсурсы ў правядзенні агітацыйных мерапрыемстваў.

Стварэнне легальнага крыла было заўсёды актуальным для левырадыкальнай плыні беларускага руху ў Заходняй Беларусі. Яскравымі прыкладамі гэтага стала функцыянаванне Беларускай сялянска-работніцкай грамады, Беларускага пасольскага клуба "Змаганне", актыўнае разгортванне каапературыўнага руху ў канцы 1920-х гг., што давала магчымасці, не выходзячы за межы польскага заканадаўства, абараняць нацыянальныя правы беларускага народа і выступаць за аб'яднанне беларускіх земляў. Менш вядомая ў гэтым рэчышчы гісторыя групы левырадыкальнай моладзі, якая мела назву *Цэнтр нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі* (далей — Цэнтр).

pawet.net

На пачатку 1930-х гг. магчымасці разгортвання легальнага левper радыкальнага руху ў Заходняй Беларусі былі значна абмежаванымі. У 1930 г. польскія ўлады намагаліся ліквідаваць павятовыя сакратарыяты Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клуба “Змаганне” і арыштаваць большасць іх кіраўнікоў. 30 жніўня 1930 г. па распараджэнні Ю.Пілсудскага быў распушчаны польскі парламент, і адразу ж пачаліся арышты дэпутатаў клуба “Змаганне” — І.Дварчаніна, Ф.Валынца, Я.Гаўрыліка і іншых, якія, карыстаючыся дэпутацкай недатыкальнасцю, актыўна вялі левардыкальную дзейнасць [1, с. 231—232]. У сувязі з новымі выбарамі дзеячы КПЗБ разгарнулі шырокую кампанію для аднаўлення парламенцкага прадстаўніцтва, лідарам якой стаў вядомы беларускі палітычны дзеяч Б.Тарашкевіч. У прыватнасці, камуністы выдалі больш за 50 тыс. адозваў і ўлётак для правядзення перадвыбарчай агітацыі [2, с. 96]. Аднак рэпрэсіі з боку польскіх уладаў і вельмі моцны адміністрацыйны ціск прывялі да таго, што беларускія левардыкалы не змаглі забяспечыць для сябе доступ да парламенцкай трыбуны. Моцным ударам па легальных формах дзейнасці сталі судовыя працэсы, арганізаваныя з мэтай паказаць польскай грамадскасці ўсю *“небяспеку і антыдзяржаўны напрамак”* беларускага руху ў Заходняй Беларусі. Такімі працэсамі былі суды над Б.Тарашкевічам у 1932 г. і над актыўнымі дзеячамі Таварыства беларускай школы ў 1933 г. [3, с. 231].

Крызіс легальных формаў дзейнасці ў беларускім левардыкальным руху суправаджаўся таксама агульным змяншэннем прасавецкіх сімпатый у грамадстве міжваеннай Польшчы. Звесткі пра разгортванне палітычных рэпрэсій у СССР, барацьбу з унутрыпартыйнай апазіцыяй, гвалтоўныя захады ў правядзенні калектывізацыі актыўна абмяркоўваліся ў тагачаснай інфармацыйнай прасторы Польшчы і, безумоўна, падхопліваліся мясцовай прапагандай. Як прызнавалі самі дзеячы КПЗБ, зніжэнне даверу да камуністычнай агітацыі ў пачатку 1930-х гг. было выклікана прыватнай карэспандэнцыяй, што дасылалі сваякам у Заходнюю Беларусь мігранты, якія нелегальна перасяклі польска-савецкую мяжу і пражывалі ў СССР [4, s. 181]. Таму для актыву КПЗБ стала актуальным стварыць пазітыўны вобраз савецкай дзяржавы, асабліва ў асяроддзі моладзі, у якім значнымі канкурэнтамі былі польскія адукацыйныя ўстановы і моладзевыя арганізацыі. Менавіта гэтая ўзроставая група была выбрана ў якасці прамоўтэра новага легальнага праекта заходнебеларускіх левардыкалаў, які пачаў стварацца ў Вільні ў 1932—1933 гг.

Спробы арганізаваць групу маладых журналістаў-левардыкалаў з далейшым выданнем яе друкаванага органа рабіліся на пачатку 1932 г. У прыватнасці, у студзені і лютым 1932 г. у Вільні выйшла два нумары часопіса “Пралом”, які выдавалі Я.Гарох і Я.Скурко (будучы паэт Максім Танк). У часопісе вельмі востра крытыкаваліся некамуністычныя плыні беларускага руху (“беларуская санацыя”, хрысціянскія дэмакраты і інш.), станоўча характарызавалася ўнутраная і знешняя палітыка СССР, узнімалася тэма цяжкага становішча палітзняволеных у польскіх турмах. Аднак тэхнічныя і, магчыма, фінансавыя сродкі не дазвалялі маладым людзям зрабіць якаснае выданне — напрыклад, другі нумар часопіса друкаваўся на гектографе [5, с. 299]. Польскія ўлады ўвогуле лічылі гэтае выданне не часопісам, а “павялічанай лістоўкай” [6, арк. 10 адв.]. Верагодна, па тэхнічных прычынах выдавецкая ініцыятыва беларускіх левардыкалаў была перанесеная ў Львоў, дзе яны выдалі дзве газеты-аднадзёнкі — “Беларускае жыццё” (7 красавіка 1932 г.) і “Жыццё” (12 ліпеня 1932 г.). На старонках газет таксама друкаваўся малады Максім Танк, а агульны змест выданняў не адрозніваўся ад папярэдняга — “Пралома” [6, арк. 10 адв.—11]. Жыццё гэтых праектаў аказалася нядоўгім: іх арганізатары і аўтары неўзабаве былі арыштаваны польскай паліцыяй.

У ліпені 1932 г. поле для ажыццяўлення легальнай левардыкальнай дзейнасці ў Польшчы стала больш шырокім. Была заключана савецка-польская дамова аб ненападзе, і на некаторы час градус геапалітычнага супрацьстаяння паміж краінамі знізіўся. Гэты момант быў выкарыстаны сябрамі КПЗБ для актыўнага стварэння новых палітычных праектаў [7, с. 266]. У снежні 1932 г. польская паліцыя знайшла ў Маладзечанскім павеце першы нумар *“Бюлетэня Цэнтра нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі”*, на якім была пазнака аб месцы і даце выдання — *“Вільня, жнівень 1932 г.”*. Гэты бюлетэнь стаў першым прыкладам выкарыстання назвы *Цэнтр нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі*, хаця да сённяшняга часу невядома, хто першапачаткова ўваходзіў у гэтую групу левардыкальных актывістаў і з’яўляўся аўтарам яе друкаваных матэрыялаў [6, арк. 14 адв.]. Паводле ўспамінаў Якуба Міско — аднаго з актыўных удзельнікаў тагачаснага беларускага левардыкальнага руху, віленскія актывісты КПЗБ прапанавалі яму далучыцца да працы Цэнтра ў канцы жніўня 1932 г., гэта значыць, што нейкая арганізацыйная структура ўжо была створана ў гэты час [8, с. 117]. Верагодна, сам Міско і спрычыніўся да выдання бюлетэня. У ім сярод іншага падкрэслівалася пераемнасць традыцый левардыкальнага беларускага руху: “*Беларускія народныя масы ад пачатку акупацыі праводзяць непарыўную барацьбу… Партызанка 1919—1924 гг. змянілася 100-тысячнай Грамадой. Месца Грамады заняло “Змаганне”. Цяпер Цэнтр нацыянальна-вызваленчага руху бярэ гэты сцяг…*” [6, арк. 15]. Іншымі словамі, Цэнтр разумеўся як новая структура, якая павінна была заняць нішу легальнай арганізацыі побач з нелегальнымі ячэйкамі КПЗБ.

Не ведаючы, хто з’яўляўся ініцыятарам стварэння Цэнтра, тым не менш дакладна можна сцвярджаць, што ажыўленне яго выдавецкай дзейнасці было цесна звязанае з прыездам у Заходнюю Беларусь пісьменніка і журналіста Валянціна Таўлая. У 1930—1932 гг.




*Удзельнікі Акруговага з'езда Таварыства беларускай школы ў Беластоку. 1929 г. У першым шэрагу сядзіць чацвёртая злева Алена Буднік — карэктар "Беларускай газэты" і актывістка Цэнтра нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Беларускі дзяржаўны архіў кінафонафотадакументаў.*

у Мінску ён працаваў у рэдакцыі газеты "Звязда". Атрымаўшы значны выдавецкі вопыт, Таўлай, паводле адной з яго аўтабіяграфій, у снежні 1932 г. па распараджэнні мінскага прадстаўніцтва ЦК КПЗБ быў накіраваны на падпольную работу ў Заходнюю Беларусь [9, с. 28]. Гэты факт адлюстроўваў той інтарэс, які праяўлялі ўлады БССР да арганізацыі новай легальнай структуры ў Заходняй Беларусі. І сапраўды, пасля прыбыцця Таўлая ў Польшчу колькасць друкаваных матэрыялаў за подпісам Цэнтра значна павялічылася. Іх пачынаюць знаходзіць не толькі ў Вільні, але і ў правінцыі, што сведчыла пра арганізацыю сеткі распаўсюджвання [6, арк. 17].

Пашыралася і тэматыка лістовак Цэнтра: яны былі адрасаваныя працоўным заходнебеларускіх гарадоў, сялянам, інтэлігенцыі, вучням беларускіх гімназій, студэнтам. У іх утрымліваліся вострая крытыка нацыянальнай і сацыяльнай палітыкі польскіх уладаў, услаўленне савецкай эканамічнай сістэмы, выказваліся негатыўныя, а часам наўпрост тэндэнцыйныя ацэнкі дзейнасці некамуністычных беларускіх арганізацый, такіх як Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), група Луцкевіча — Астроўскага і інш. Услед за тымі працэсамі, што адбываліся ў БССР па барацьбе з "нацыянал-дэмакратызмам", заходнебеларускія камуністы пераносілі падобныя ацэнкі і на сваю рэчаіснасць. Таму многія прадстаўнікі некамуністычных плыняў беларускага руху атрымлівалі ярлыкі "нацыянал-фашыстаў", "нацыянал-апартуністаў" і г. д. Гэта датычылася і некаторых уплывовых актывістаў ТБШ, якія выступалі супраць палітызацыі таварыства і за правядзенне выключна культурнай дзейнасці з мэтай захаваць арганізацыю. У прыватнасці, кіраўнікі ТБШ Ф.Стэцкевіч, Р.Шырма, М.Марцінчык і інш. падвергліся ў гэты час астракізму з боку прасавецкіх леварадыкалаў.

Яшчэ ў кастрычніку 1932 г. сябрамі Цэнтра высоўвалася ідэя заснавання ў Вільні легальнага друкаванага органа. Як узгадваў Я.Міско, доўгі час яны не маглі знайсці неабходнае памяшканне для рэдакцыі і дамовіцца з друкарнямі [8, с. 119]. У рэшце рэшт у чэрвені 1933 г. выдавецкі праект Цэнтра быў рэалізаваны пад назвай *"Беларуская газэта"*. Удзел у гэтым праекце ў якасці



*Рэдактар “Беларускай газэты”
Аляксандр Карповіч.
Прага, 1930-я гг.
Фота з прыватнага збору С.Кнырэвіча.*



*П.Пестрак (сядзіць у цэнтры)
з сябрамі турэмнага камітэту палітзняволеных
пасля вызвалення з Гродзенскай турмы. Верасень 1939 г.
Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей.*

тэхнічных супрацоўнікаў першапачаткова прымалі Я.Міско і В.Таўлай. Са снежня 1933 г. на змену ім у рэдакцыю газеты прыйшлі Алена Буднік і паэт Янка Патаповіч (псеўданім Янка Чабор) [6, арк. 33]. Рэдактарам выдання стаў інжынер Аляксандр Карповіч. Ураджэнец вёскі Трашчычы Навагрудскага павета (цяпер Карэліцкі раён), ён у 1931 г. скончыў лесатэхнічны факультэт Пражскага політэхнічнага ўніверсітэта. Яшчэ пад час вучобы ў Чэхаславакіі Карповіч стаў актыўным прыхільнікам марксісцкіх ідэй і зблізіўся з прасавецкімі студэнцкімі арганізацыямі, што паўплывала на яго далейшы палітычны выбар [10, с. 281]. Пасля заканчэння вучобы ён вярнуўся ў Заходнюю Беларусь і вясною 1933 г. пераехаў жыць у Вільню, дзе, верагодна, і далучыўся да дзейнасці Цэнтра [11, с. 286]. Таксама ў рэдакцыі газеты працавалі прадстаўнікі ЦК КПЗБ, першапачаткова яшчэ адзін выпускнік чэхаславацкіх універсітэтаў Фёдар Аніскевіч і Язэп Прэдка, якія сачылі за агульным зместам друкуемых матэрыялаў. Апошні, па інфармацыі польскіх уладаў, быў спецыяльна дзеля гэтай мэты накіраваны ў Вільню з Мінску [6, арк. 33].

У першым рэдакцыйным артыкуле *“Беларускай газэты”* падкрэсліваўся значны недахоп друкаванага беларускага слова, што сапраўды з’яўлялася праблемай, асабліва для сельскага насельніцтва, ва ўмовах татальнай паланізацыі. Між іншым, аўтары газеты пазначалі: “*Нацыянальна-адраджэнская праца ў Заходняй Беларусі, перамагаючы спатыканыя на сваім шляху труднасці, ідзе няўпынным крокам наперад… Вялікай балячкай нашага руху сягоння ёсць амаль поўная адсутнасць прэсы ў роднай мове. З усіх куткоў нашага краю даносіцца голас: “Дайце газету! Дайце нам праўду аб тым, што дзеецца ў свеце!*” [12]. Ужо з першага нумару выданне выявіла свой левы палітычны накірунак, змясціўшы некалькі рэзка крытычных нарысаў адносна прадстаўнікоў БХД і беларускіх паланафільскіх арганізацый. Вялікая ўвага аўтарамі газеты надавалася пытанням беларускага асветніцтва, развіцця беларускай культуры і самаадукацыі ў рэчышчы пашырэння роднай мовы [13]. Гэта дае падставы сцвярджаць менавіта пра нацыянальную накіраванасць беларускіх леварадыкалаў і актыву КПЗБ, іх адданасць традыцыям беларускага руху.

Як выявілася ў ходзе следства, большасць нумароў *“Беларускай газэты”* дасылалася па старых спісах падпісчыкаў прэсы БСРГ і “Змагання”, якія былі ў наяўнасці ў рэдакцыі. Больш за тое, было ўстаноўлена, што нумары газеты дасылаліся пераважна бясплатна, за невялікім выключэннем падпіскі і грашовых ахвяраванняў. Крыніцы фінансавання ў польскіх улад выклікалі падазрэнне, аднак, відавочна, яны паходзілі з грашовых фондаў КПЗБ. У прыватнасці, рэдактар А.Карповіч плаціў друкарні за выданне аднаго нумара газеты колькасцю дзве тысячы асобнікаў 125 злотых. Усяго было выдадзена 17 нумароў, значыць, у цэлым рэдакцыя выдаткавала на гэтую мэту каля 2200 злотых без уліку выплат сваім супрацоўнікам. У той жа час дзякуючы падпісцы і ахвяраванням *“Беларуская газэта”* змагла зарабіць толькі крыху больш за 200 злотых, што не пакрывала ўсе выдаткі рэдакцыі [6, арк. 33—33 адв.].

Заўважым, што, хаця фінансаванне ажыццяўлялася праз партыйную касу і дазваляла бясплатна распаўсюджваць газету, гэта не забяспечвала яе якаснага друку і перыядычнасці. Выданне выходзіла толькі два разы на месяц, што ўказвала на абмежаванасць выдаткаваных сум на гэты легальны праект.

Маючы адрасы былых левapадыкальных актывістаў і дасылаючы ім бясплатна свае выданні, дзеячы Цэнтра нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі імкнуліся такім чынам мець арганізацыйную базу на правінцыі і стварыць падмурак для далейшай легальнай дзейнасці. Аднак яны не ўлічвалі таго факта, што ў 1930-я гг. сітуацыя ў Заходняй Беларусі значна змянілася. Гэты перыяд у беларускім руху характарызаваўся крызіснымі з’явамі, якія былі выкліканы рэпрэсіямі з боку ўладаў і цэнтрабежнымі тэндэнцыямі ў самім руху. Многія былыя актывісты, страціўшы сувязі з беларускімі арганізацыямі, больш не цікавіліся палітычнымі ці грамадскімі справамі, пачыналі адаптавацца да ўмоў жыцця ў польскім грамадстве. Таму гэта абмяжоўвала мэтавую аўдыторыю новага выдання. Так, паводле дадзеных па Навагрудскім ваяводстве на верасень 1933 г., у Слонімскім павеце газета прыходзіла да 17 чалавек, у Навагрудскім — да 29, у Стаўпецкім — да 28, у Баранавіцкім — да 25, у Лідскім — усяго да 5 чалавек [14, арк. 81 адв.]. Не выключана, што некаторыя падпісчыкі газеты маглі адразу яе ліквідаваць, бо баяліся наступстваў для сябе з боку польскай паліцыі ці мясцовай адміністрацыі. Каля 100 асобнікаў выдання распаўсюджвалася ў Вільні, столькі ж — у Беластоку праз беларускі выдавецкі кааператыў “Сяўба” сярод сябраў КПЗБ і ТБШ [7, с. 266]. Такая ж сітуацыя была і ў іншых паветах Заходняй Беларусі — асноўнымі атрымальнікамі выдання былі актывісты КПЗБ і іншых левapадыкальных беларускіх груп [6, арк. 45].

Трэба прызнаць, што дзеячам Цэнтра ўдалося актывізаваць цэлы шэраг правінцыйных дзеячаў, якія пачалі дасылаць у “*Беларускую газэту*” допісы аб розных падзеях палітычнага ці эканамічнага характару ў сваёй мясцовасці. У прыватнасці, у Гродна карэспандэнтам выдання быў Зміцер Кулакоўскі, у мінулым — сакратар Гродзенскай акруговай управы ТБШ [6, арк. 42; 15, с. 141]. Таксама вакол выдання пачала афармляцца група маладых беларускіх літаратараў, пераважна паэтаў, левapадыкальнай арыентацыі. У газету дасылалі свае вершы, карэспандэнцыі і фельетоны Францішак Грышкевіч, Міхась Касцевіч (Міхась Васілёк), Іван Івашэвіч (Пятрусь Граніт), Янка Патаповіч (Янка Чабор), Піліп Пестрак (Звястун), Міхась Карась (Міхась Явар), Аляксей Рэдзька (пазней больш вядомы пад псеўданімам Алесь Дубровіч), Павел Сошка і інш. Для некаторых аўтараў з гэтага пераліку, напрыклад для Аляксея Рэдзькі ці Паўла Сошкі, старонкі “*Беларускай газэты*” сталі дэбютнымі ў іх літаратурнай творчасці [6, арк. 43]. З 8-га нумара ў газеце пачаў друкавацца дадатак “Літаратурная старонка”, дзе маладыя літаратары маглі не толькі надрукаваць свае




*Вокладка апошняга нумара гумарыстычнага часопіса “Асва”, рэдактарам якога быў П.Радзюк.*

творы, але і атрымаць пэўныя рэкамендацыі і крытычныя заўвагі ад рэдакцыі, за што ў рэдакцыі адказваў В.Таўлай.

Творчы ўздым, які быў звязаны з дзейнасцю маладых літаратараў на старонках “*Беларускай газэты*”, штурхаў іх да пэўнага самаакрэслення ў культурным дыскурсе Заходняй Беларусі. Яшчэ ў 1931 г. Янка Патаповіч, як адзін з асноўных натхняльнікаў новай літаратурнай групы, заклікаў маладых заходнебеларускіх пісьменнікаў аб’яднацца ў літаратурную арганізацыю і пачаць выданне ўласнага часопіса [7, с. 267]. Аднак гэтыя заклікі былі пачутыя толькі праз два гады. 10 снежня 1933 г. на кватэры Любові Асаевіч, будучай жонкі Максіма Танка, якая з’яўлялася тэхнічным супрацоўнікам рэдакцыі *“Беларускай газэты”*, адбылася нелегальная канферэнцыя левapадыкальных пісьменнікаў Заходняй Беларусі [8, с. 121]. Як сцвярджаў В.Таўлай у аўтабіяграфіі, ініцыятыва арганізацыі канферэнцыі належала менавіта яму [9, с. 28]. На ёй было прынята рашэнне аб стварэнні *Літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў* і яго друкаванага органа — часопіса *“Літаратурная старонка”*.

Новы часопіс пабачыў свет у канцы студзеня 1934 г. пад рэдакцыяй Янкі Патаповіча, аднак значную ролю ў яго выданні адыгрываў В.Таўлай. Сярод іншага



Przesyłka opłacona gotówką 40%.

Цана асобнага нумру 15 гр.

# БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

№ 14 | Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Людвісарская 8–8. | Вільня, 31-га сьнежня 1933 | Выходзіць два разы ў месяц. | Год I.

Прыймо інтарэсантаў у рэдакцыі штодзень ад 9-й да 4-й гадзіны. | Цана падпіскі з дастаўкай поштай: у месяц—25 гр., у 3 » —70 » | у ½ года—1.30, у 1 год —2.50 | Konto P.K.O. Nr. 144.511 Уласьнік конта—Інж. Я. КАРПОВІЧ.

## УСІХ ПРАЦОЎНЫХ ВІТАЕМ З НОВЫМ ГОДАМ!

## На рубяжы гадоў.

1933 год—год існаваньня „Беларускае Газэты“—быў ува ўсіх дзяржавах, ахопленых крызісам, годам далейшага заладаньня працоўных у бяздоньне галечы. На сусьветнай арэне год прынёс шмат вялікіх зьмен, быў годам асаблівай напружанасьці і яшчэ больш насыціў порахам атмасфэру міжнародных адносін.

Старыя асновы „міру“, абапертыя на штыках Вэрсалю,—надламаліся. У постаці гітлерызму на гістарычную сцэну выступіў ваяўнічы ня-

Пры такіх складаных умовах, у такі адказны час паўстала „Беларуская Газэта“, каб сказаць свайму народу праўду аб тым, што робіцца на сьвеце і ў краі, паўстала, каб раскрываць таямніцы здрады БХД, беларускай санацыі ды іх агентуры ў сярмяжных шэрагах.

Зразумелі нас народныя гушчы. Сьціснутыя рукою галечы, яны ўсё-ж т'кі прышлі з дапамогай сваёй газэце. Больш двух тысяч атрыманых нашай рэдакцыяй лістоў, усьцяж новыя платныя падпішчыкі і сталыя карэспандэнты, гуртаваньне літэратурнага маладняка—вось як адгукнуўся наш народ на наш пачын.

## Перамога ТБШ.

У нядзелю 17га сьнежня адбыўся ў г. Беластоку акружны зьезд Таварыства Беларускае Школы. На зьезд прыехалі дэлегаты з Беласточчыны, Ваўкавышчыны і Горадзеншчыны. Многія з іх ехалі коньмі аж з-пад Сьвіслачы. Да пачатку зьезду было дэлегатаў з рашаючым голасам да 40, а разам з госьцямі каля 100 чал.

Характэрнаю рысаю зьезду была *згуртаванасьць і самастойнасьць мясцовых тэбэшоўскіх дзеячоў*, якія сваім зьездам кіравалі самы, без «дапамогі» Марцінчыкаў і Лукашыкаў. Зьезд віталі прадстаўнікі работніцкіх арганізацый Беластоку.



СТУДЗЕНЬ

# ЛІТЭРАТУРНАЯ СТАРОНКА

Месячнік Літэратуры, Мастацтва і Крытыкі

№ 1 1934 г.



### ЗЬМЕСТ.

| | | стар |
|---|---|---|
| 1. | Дэклярацыя | 1 |
| 2. | **Янка Чабор** — Заклік — верш | 5 |
| 3. | **Янка Чабор** — Гэй, арліна мая сіла — верш | 6 |
| 4. | Пачын падтрымайце чынам | 7 |
| 5. | **М. Васілёк** — Я пішу як магу — верш. | 8 |
| 6. | **М. Васілёк** — Зьмяя, кatoрy ўзгадавала — верш. | 9 |
| 7. | **М. Васілёк** — Пад гукі струн.. | 9 |
| 8. | **М. Рушіч** — На новым этапе. | 10 |
| 9. | **Зьвястун** — Моладзі-верш | 12 |
| 10. | **Фр. Грышкевіч** — Калі я раз... — верш | 13 |
| 11. | **Анатоль Іверс** — Вёска — верш | 14 |
| 12. | **Наста** — Пад белымі крыжамі | 14 |
| 13. | Там дзе шуміць каласістае гора — верш | 16 |
| 14. | **Міхтар** — Расказ | 17 |
| 15. | **У. Т.** — Наперад — верш. | 18 |
| 16. | **Алесь Салагуб** — А хто ў полі?... — верш | 19 |
| 17. | **Лявон Кручкоўскі** — На што мужыкам школа. | 20 |
| 18. | **А. А-скі** — У настрозе — верш | 24 |
| 19. | **Пятрусь Граніт** — Каваль — верш | 25 |
| 20. | **Ю. Б—а** — Хай доля.. — верш | 25 |
| 21. | **У—р Шчыры** — Дзяўчыне — верш | 26 |
| 22. | **А. Радзьма** — Мы — верш | 27 |
| 23. | **Міхась Ліст** — Што ты Нёман.. — верш | 27 |
| 24. | **Н. Жальба** — Акрыльнай думку... — верш | 28 |
| 25. | **К—е** — Плача восень — верш. | 28 |
| 26. | Літэратурны фронт. **Мікола Засім** — Прашу слова. **Фр. Гр.** — Мастацкая літэратура Гранады | 29 |
| 27. | Адказы рэдакцыі | 30 |
| 28. | У віры жыцьця | 32 |

**Варункі прэнумэраты:**

На год 6.— зл. Пaaсобны номер 0.50 зл.

Выдае ЯНКА ПАТАПОВІЧ. Рэдкогія Рэдкалегія. За рэдакцыю адказвае ЯНКА ПАТАПОВІЧ.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, вуліца Пілсудзкага 9, кв. 9.



АЛЕСЬ САЛАГУБ

### А ХТО Ў ПОЛІ?...

А хто ў полі рана пагукае,
А хто полі рана абуджае?
Во ці лебядзі, во ці сокалы
Абудзілі прастор, даль шырокую?
Ці аўсы, жыты сьпелым коласам
Так гудуць — шумяць людзкім голасам?
Ці бароў густых задумёнвый шум
На палі—лугі ды навеяў сум?

Ой, ня лебядзі, ой ня сокалы,
Ні бароў густых задумёнвый шум —
Абудзілі прастор, даль глыбокую
І навеялі на краіну сум.
За высокі мур з цэглы складзены,
За жалезныя перакладзіны —
Павялі сыноў — льлецца ціхі стогн —
Мчецца ціхі стогн з па-за крат вакон.

Ня шуміць там бор, не зашастае,
Ня відаць з вакна сонца яснага,
Ня шуміць жытцо сьпелым коласам,
Не пяе жняя поўным голасам.
Не бадыль сухі да долу хіліцца
Аб асфальт-сьцяну б'е патыліцай.
Бы падрэзаны ды касой чарот
Сьмягне там ратай малады з сухот...

Ой, ня чуць яму слоў пяшчотлівых
Ой, ня сьніці сноў безклапотлівых.
Дзе гладзяць цяпер вочы ясныя?
Дзе падзелася доля шчасная?
Дзе зьвініць каса, каса звонкая,
Дзе гамоніць поч ды з сасонкамі,
Дзе бурляць, ня спяць хвалі Нёмана
У ночы летнія, ночы цёмныя. .

19

ў часопісе была надрукавана *Дэкларацыя групы паэтаў да ўсіх пісьменнікаў Заходняй Беларусі*. Яна ўяўляла сабой вельмі цікавы дакумент, які засведчыў прыход у беларускую літаратуру новага пакалення паэтаў — пакалення заходнебеларускай моладзі, якое нарадзілася ў часы Першай сусветнай вайны, зведала ўсе цяжкасці бежанства, вяртання ў Заходнюю Беларусь і сутыкненне з рэаліямі міжваеннай Польшчы. Многія прадстаўнікі гэтага пакалення вучыліся ў беларускіх гімназіях, дзе вельмі цесна зблізіліся з беларускім літаратурным словам, уключыліся ў культурна-асветніцкі дыскурс і такім чынам прыйшлі ў паэзію.

У дэкларацыі, між іншым, гучала вельмі моцная сімпатыя да рэвалюцыйных пераўтварэнняў у Расіі, што сведчыла пра адпаведны ідэйны напрамак гэтага пакалення. Літаратурная творчасць маладымі паэтамі бачылася як неад’емная частка нацыянальнага руху, а таксама як важны элемент сацыяльнай мадэрнізацыі. *“Гісторыя літаратурна-творчага руху на Заходняй Беларусі з’яўляецца гісторыяй сацыяльнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы пакрыўджанага народа”* — падкрэслівалі аўтары дэкларацыі [16, с. 3]. Яна завяршалася заклікам моладзі далучацца да іх ініцыятывы і падтрымаць *“Літаратурную старонку”*. Свае подпісы


Akt Nr 1061/34
Więzień śledczy z art. 97 KK
...ko Taułaj
Imię Walenty
Pawilon I
Cela Nr 194

Do
Pana Prokuratora S.O. w Wilnie
XIII okr.

OTRZYMANO 17 SIER 1936
w Wilnie na Łukiszkach

Podanie
Uprzejmie proszę o zezwolenie na otrzymanie podręczników naukowych z dziedziny fizyki, chemji i matematyki. –
W Taułaj
Wilno, 15 sierpnia 1936 r.

*Заява вязня Валянціна Таўлая з просьбай дазволу на атрыманне падручнікаў па фізіцы, хіміі і матэматыцы. Турма Лукішкі, 1936 г. Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы. Друкуецца ўпершыню.*

пад дэкларацыяй паставілі Янка Патаповіч, Міхась Васілёк, Аляксей Рэдзька, Пятрусь Граніт, Піліп Пестрак і Анатоль Іверс [16, с. 4]. Аднак гэтае выступленне выклікала цікавасць у першую чаргу ў польскіх спецслужбаў, якія ўбачылі ў ім антыдзяржаўны змест. Часопіс быў выдадзены ў 1000 асобнікаў, аднак адразу ж пасля выхаду польскія ўлады пачалі канфіскоўваць гэтае выданне, праўда, рэдакцыі ўдалося захаваць і распаўсюдзіць каля 20% наклада [6, арк. 35; 7, с. 268].

Яшчэ адным выдавецкім праектам Цэнтра нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі можна лічыць сатырычны часопіс *"Асва"* пад рэдакцыяй студэнта Віленскага ўніверсітэта Пятра Радзюка. Усяго з 25 сакавіка па 25 жніўня 1934 г. выйшла 6 нумароў [17, s. 119—120]. У часопісе крытыкаваліся палітыка Польшчы адносна нацыянальных меншасцяў, беларускія некамуністычныя арганізацыі і асабіста іх лідары, друкаваліся творы беларускіх левапрадыкальных паэтаў. Змест некаторых матэрыялаў часопіса быў настолькі рэзкім, што ўжо яго другі нумар быў канфіскаваны ўладамі за карыкатуру пра падаткі [6, арк. 37]. Як і *"Беларуская газэта"*, часопіс *"Асва"* распаўсюджваўся пераважна бясплатна, дасылаўся актывістам КПЗБ і былым падпісчыкам прэсы БСРГ. Цікава, што гэтае выданне прыходзіла нават у тыя часткі Заходняй Беларусі, дзе беларускі рух меў вельмі слабыя пазіцыі, напрыклад у Драгічынскі павет Палескага ваяводства [6, арк. 46]. Як было ўстаноўлена ўладамі, змест часопіса зачытваўся на нелегальных сходах ячэек КПЗБ. Такі факт быў выяўлены ў Лідскім павеце [6, арк. 40 адв.]. Пасля 6-га нумара выданне спыніла свой выхад, а яго рэдактар П.Радзюк быў арыштаваны ўладамі.

Падобным чынам скончылася гісторыя і *"Беларускай газэты"*. Матэрыялы выдання набывалі ўсё больш радыкальна-крытычны характар адносна Польскай дзяржавы. 11-ы нумар газеты за 28 лістапада 1933 г. быў канфіскаваны ўладамі з-за шэрагу артыкулаў і нататак пра выбары ў органы мясцовага самакіравання. У прыватнасці, рэдакцыя ў адным з артыкулаў сцвярджала, што мае дакумент з 126 подпісамі жыхароў в. Рачканы Баранавіцкага павета, якія пратэставалі супраць парушэнняў пад час галасавання з боку мясцовай адміністрацыі. Наступны нумар быў выдадзены ўжо з "белымі палосамі" замест канфіскаваных матэрыялаў [6, арк. 29]. Сітуацыя з газетай значна ўскладнілася, калі ў студзені 1934 г. за спробу перасекчы польска-савецкую мяжу былі арыштаваныя В.Таўлай і Я.Міско [8, с. 123]. Апошні нумар выдання выйшаў 30 студзеня 1934 г., пасля гэтага ў пачатку лютага былі арыштаваныя рэдактар А.Карповіч, а таксама тэхнічныя супрацоўнікі А.Буднік, Я.Патаповіч і інш. Фактычна на гэты час большасць актыву Цэнтра нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ўжо знаходзілася за кратамі польскіх турмаў.

Пасля арышту Карповіча ў яго знайшлі спіс 19 найбольш актыўных карэспандэнтаў "Беларускай газэты". Таму неўзабаве пачаліся іх затрыманні іператрусы з мэтай знайсці кампраметуючыя матэрыялы. Так, калі паліцыя ўвайшла ў хату, дзе жыў А.Рэдзька, той адразу выхапіў з кішэні некалькі папер, паклаў іх у рот і пачаў жаваць. Пасля выявілася, што гэта былі ўлёткі КПЗБ [6, арк. 43]. У іншых актывістаў знайшлі рукапісы карэспандэнцый у *"Беларускую газэту"*, чарнавікі літаратурных твораў, савецкія кнігі ці перыядычныя выданні, агітацыйныя матэрыялы КПЗБ. У М.Васілька пад часператрусу быў выяўлены ліст ад Алеся Салагуба, заходнебеларускага паэта, які на той час жыў у Мінску, аднак цікавіўся літаратурным дыскурсам у Польшчы [6, арк. 41 адв.].

Паступова актывісты Цэнтра і карэспандэнты яго перыядычных выданняў, якіх польская паліцыя затрымала ў розных мясцовасцях, былі аб'яднаныя следчымі органамі ў адну судовую справу. Дзеля гэтага іх перавялі ў знакамітую Лукішскую турму ў Вільні. У прыватнасці, П.Пестрак быў арыштаваны ў лютым 1934 г. у Пінску за нелегальную дзейнасць у рамках КПЗБ і змешчаны ў пінскую турму. Аднак у 1935 г. яго перавялі ў Вільню і далучылі да агульнай справы Цэнтра за тое, што Пестрак дасылаў у "*Літаратурную старонку*" і "*Беларускую газэту*" свае вершы. Агульнае лаканічнае ўражанне ад віленскай турмы ён пакінуў у сваіх успамінах: "*Турма "Лукішкі" пасля Пінскай здалася мне раем*" [18, с. 146]. Дарэчы, на допытах Пестрак цалкам адмаўляў свой удзел у дзейнасці КПЗБ і супрацоўніцтва з Цэнтрам. Ён заяўляў, што прыбыў у Пінскі павет не дзеля агітацыі, а ў пошуках працы, што ніякай палітыкай увогуле не планаваў займацца, не дасылаў рукапісы ў левапрадыкальныя выданні [6, арк. 57]. Падобныя паводзіны часта назіраліся сярод шараговых беларускіх актывістаў, бо партыйнае кіраўніцтва

звычайна раіла ім усялякім чынам адмаўляць свае сувязі з падполлем. Праўда, Пестрак рабіў гэта вельмі неасцярожна. Напрыклад, ён назваў следчаму прадпрыемства на Палессі, куды нібыта хацеў уладкавацца на працу, аднак яго ўжо не існавала некалькі гадоў. Следчымі таксама была праведзена каліграфічная экспертыза, якая выявіла, што рукапісы, дасланыя ў рэдакцыю "Беларускай газэты" пад псеўданімам Звястун, належалі Пестраку [6, арк. 57—58].

Пад час следчых дзеянняў над актывістамі Цэнтра выявілася, што ў рамках гэтага легальнага праекта дзейнічалі не толькі маладыя людзі, але і дзеячы з пэўным вопытам работы ў беларускім руху. Такой з'яўлялася, напрыклад, Алена Буднік, якая працавала ў "Беларускай газэце" карэктарам. У 1921 г. пасля заканчэння беларускіх настаўніцкіх курсаў у Вільні яна далучылася да эсэраўскага руху на Гродзеншчыне. У часы існавання Грамады Буднік была актыўным сябрам Беластоцкага павятовага камітэта, арганізоўвала грамадоўскія гурткі ў ваколіцах Супрасля. Пасля ліквідацыі партыі яна перайшла на працу ў ТБШ, з'яўлялася ўдзельніцай Акруговага з'езда гэтай арганізацыі ў Беластоку ў снежні 1929 г. У ТБШ Буднік была прыхільніцай лініі "палітызацыі" таварыства, актыўна змагаючыся супраць "культурніцкай" плыні. Таксама мела вопыт супрацоўніцтва з дзеячамі пасольскага клуба "Змаганне" ў 1928—1930 гг. Некалькі разоў затрымлівалася польскімі ўладамі за палітычную дзейнасць, аднак знаходзілася ў турмах непрацяглы тэрмін. У 1933 г. яна напісала ліст да А.Карповіча, які адразу прыняў яе ў рэдакцыю газеты ў якасці карэктара [6, арк. 51—52; 15, с. 54].

Следчыя і віленская пракуратура хацелі па максімуму раскруціць справу Цэнтра і такім чынам нанесці моцны ўдар па прасавецкіх сімпатыях у асяроддзі беларускай моладзі. Яе вёў вядомы віленскі пракурор Дамінік Пятроўскі, які меў рэпутацыю "спецыяліста па беларускай справе", бо раней ён таксама прымаў удзел у некалькіх судовых працэсах над беларускімі дзеячамі. Абвінаваўчы акт, падрыхтаваны Д.Пятроўскім, налічваў 168 старонак машынапіснага тэксту. У ім пракурор даводзіў, што Цэнтр мае ідэйныя вытокі ад перыяду існавання БСРГ, падкрэсліваў яго цесную сувязь з КПЗБ і іншымі левардыкальнымі структурамі, паказваў палітычны, а не творчы характар дзейнасці яго сябраў. Галоўнай мэтай Цэнтра была, паводле Пятроўскага, *"змена існуючага дзяржаўнага ладу Польскай рэспублікі і адарванне часткі яе тэрыторыі"*, што азначала імкненне актывістаў да аб'яднання беларускіх земляў [6, арк. 57].

Судовы працэс па справе Цэнтра распачаўся ў Віленскім акруговым судзе 23 сакавіка 1936 г. Неабходна заўважыць, што гэта быў апошні маштабны працэс над беларускімі актывістамі ў міжваеннай Польшчы. У выніку дзейнасці польскіх следчых на лаве падсудных аказалася 16 дзеячаў, сярод іх палова (Я.Міско, А.Карповіч, В.Таўлай, Я.Патаповіч, А.Рэдзька, П.Пестрак, А.Буднік, П.Радзюк) з'яўлялася найбольш актыўнымі прадстаўнікамі Цэнтра і маладой плеяды заходнебеларускіх літаратараў. Астатнія 8 чалавек — Разалія Крыштапаніс, Сабіна Вішнеўская, Іван Цімафееў, Фёдар Кудзіновіч, Любоў Кудзіновіч, Дзіна Мадэйскер, Іцхак Патажнік, Фрэйда Будоўніч з'яўляліся тэхнічнымі работнікамі і адказвалі за распаўсюджванне газет, утрыманне канспіратыўных кватэр, перадачу грошай і г. д. Па дадзенай справе ў цэлым праходзіла каля 70 сведак [6, арк. 85—87 адв.]. Першапачаткова на судовых пасяджэннях адсутнічаў В.Таўлай, бо цяжка хварэў на грып, аднак пасля і ён з'явіўся ў зале суда [19]. Абвінавачаных абаранялі адны з лепшых польскіх адвакатаў, спецыялістаў па палітычных працэсах — Т.Дурач, Г.Сукеніцкая, К.Петрусевіч, А.Чэрніхаў і інш.

Дадзены працэс адразу атрымаў публіцыстычную назву "працэс 16-ці" па колькасці абвінавачаных, а ў левардыкальных колах — "працэс малой Грамады" [8, с. 131]. Віленская прэса праяўляла пэўную цікавасць да гэтай падзеі і асвятляла па меры магчымасці ход судовага пасяджэння. Адзін з аглядальнікаў польскамоўнага "Кур'ера Віленскага" назваў гэты працэс "рэхам Грамады", паказваючы тым самым пераемнасць Цэнтра з іншымі легальнымі праектамі беларускіх левардыкалаў [19]. Д.Пятроўскі, выступаючы на судзе, падкрэсліваў, што Цэнтр з'яўляўся "прыбудовай КПЗБ", а ўся яго прэса выдавалася за грошы Камінтэрна. Галоўны пасыл пракурора быў у тым, што гэта працэс над камуністамі, ворагамі Польскай дзяржавы, а не над нацыянальнымі дзеячамі [20]. У сваю чаргу, абарона сцвярджала, што на лаве падсудных сядзяць маладыя беларускія патрыёты, якія хочуць дабра для свайго народа і таму дзейнічаюць у яго імя, ужываючы, у тым ліку, і радыкальныя формы працы. П.Пестрак ва ўспамінах згадваў, што падсудныя ўсялякім чынам імкнуліся выкарыстоўваць судовую трыбуну, каб паказаць усю памылковасць польскай нацыянальнай і эканамічнай палітыкі адносна беларускага народа. Апошні выступ у судзе малады паэт скончыў наступнымі словамі: *"Чым ноч цямней, тым ярчэй зоры"* [18, с. 147].

30 сакавіка 1936 г. судовы працэс быў завершаны. Віленскі суд прыгаварыў абвінавачаных па справе Цэнтра нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі А.Карповіча, Я.Міско і В.Таўлая да 8 гадоў турмы і 8 гадоў пазбаўлення ў правах, А.Буднік, Я.Патаповіча, П.Пестрака і рэдактара "*Асвы*" П.Радзюка — да 6 гадоў зняволення, А.Рэдзьку — да 4 гадоў турмы. Цікава, што да асуджаных была прыменена амністыя, паводле якой турэмныя тэрміны адразу скарачаліся, напрыклад, для Карповіча, Міско і Таўлая тэрмін быў скарочаны да 5 год. Да таго ж усім асуджаным былі залічаны тэрміны знаходжання ў турме пад следствам, што рабіла іх будучае турэмнае зняволенне яшчэ больш кароткім [21, арк. 2 адв.—3].

Першапачаткова ўсе асуджаныя адбывалі пакаранне ў віленскай Лукішскай вязніцы, аднак, паводле ўспамінаў П.Пестрака, летам 1936 г. польская паліцыя зрабіла на Віленшчыне аблаву на самагон-

шчыкаў, у турме апынулася вельмі шмат затрыманых, і таму было вырашана частку палітзняволеных накіраваць у іншыя турмы [22, с. 236]. Згодна з дакументамі 29 кастрычніка 1936 г. Пестрак, Таўлай, Міско і Радзюк разам прыбылі ў Гродзенскую турму, а астатнія фігуранты справы засталіся на Лукішках [23, арк. 78 адв.]. Першым сярод дзеячаў Цэнтра быў вызвалены А.Рэдзька, затым у 1937 г. на свабоду выйшаў А.Карповіч [11, с. 287]. У жніўні 1938 г. была вызвалена А.Буднік, а ў лютым 1939 г. Гродзенскую турму пакінуў П.Радзюк [21, арк. 5а; 8]. Даўжэй за ўсіх пакаранне адбывалі Пестрак, Таўлай і Міско, якія вызваліліся толькі пад час вераснёўскіх падзей 1939 г.

Падсумоўваючы, неабходна адзначыць, што гісторыя Цэнтра нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі непарыўна звязаная з жаданнем актыву КПЗБ набыць формы легальнасці. Гэта давала магчымасці больш маштабна праводзіць агітацыйную працу, арганізоўваць разнапланавыя выдавецкія праекты і знаходзіць новых прыхільнікаў. Фактычна Цэнтр стаў трэцяй спробай беларускіх левارадыкалаў стварыць легальны рух у Заходняй Беларусі пасля БСРГ і клуба "Змаганне", якая мела сваю спецыфіку. Калі ў першых дзвюх спробах удзел прымалі дасведчаныя беларускія дзеячы, якія мелі значны вопыт як парламенцкай, так і пазапарламенцкай дзейнасці, то ў арганізацыі Цэнтра ўдзельнічалі маладыя актывісты 20—30 гадоў. Шмат у чым прычынай гэтага былі рэпрэсіі з боку польскіх уладаў, якія фактычна "абезгаловілі" беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі. Дзейнасць маладога пакалення леварадыкалаў не заўсёды была асцярожнай і гнуткай, а жаданне перанесці палітычны дыскурс тагачаснай БССР з цкаваннем "нацдэмаў" на заходнебеларускую рэчаіснасць значна звужала колькасць іх прыхільнікаў. У той жа час Цэнтр у сваёй працы прытрымліваўся асноўных традыцый нацыянальнага руху, пашыраў беларускую культурную прастору і прыводзіў у яе новыя імёны. Гэтая акалічнасць яшчэ раз пацвярджае факт таго, што КПЗБ і іншыя беларускія леварадыкальныя групы ў Заходняй Беларусі былі неад'емнай часткай беларускага нацыянальнага руху.

1. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.) / А. Н. Мацко [и др.]. — Минск : Беларусь, 1966. — 401 с.
2. Пашкевіч, А. В. Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (1921—1930 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. В. Пашкевіч. — Мінск, 2006. — 162 с.
3. Полуян, В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927—1939 гг.) / В. А. Полуян. — Минск : Наука и техника, 1978. — 360 с.
4. Cichoracki, P. Komuniści na Polesiu w latach 1921—1939 / P. Cichoracki. — Łomianki : LTW, 2016 — 271 s.
5. Мікуліч, М. Максім Танк. Талент, заручаны з небам / М. Мікуліч. — Мінск : Літаратура і мастацтва, 2012. — 336 с.
6. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). — F. 131, ap. 2, b. 3122.
7. Гісторыя беларускай журналістыкі: [вучэбны дапаможнік для факультэтаў журналістыкі ўніверсітэтаў] / Р. В. Булацкі, І. І. Сачанка, С. В. Говін. — Мінск : Выдавецтва БДУ, 1979. — 428 с.
8. Міско, Я. Маё маўклівае сэрца: з літаратурнай спадчыны / Я. Міско. — Мінск : Юнацтва, 1983. — 493 с.
9. Крэнт, Д. Несавецкія жыццяпісы савецкіх пісьменнікаў: Малавядомыя аўтабіяграфіі Валянціна Таўлая і Піліпа Пестрака / Д. Крэнт, А. Горны // Роднае слова. — 2023. — № 6. — С. 26—30.
10. Дакументы і матэрыялы па гісторыі беларускай эміграцыі ў Чэхаславацкай Рэспубліцы (1918—1939) / уклад., прадм., камент. А. Бучы. — Мінск : Кнігазбор, 2020. — 560 с.
11. Кошур, С. А. Рэдактар "Беларускай газеты" Алесь Карповіч / С. А. Кошур // Карэлічы і Карэліцкі раён: рэгіянальныя асаблівасці развіцця X—XX стст. : зб. навук. арт. / уклад. А. Б. Доўнар; навук. рэд. В. Ф. Голубеў. — Мінск : Беларуская навука, 2021. — С. 283—287.
12. Ад рэдакцыі // Беларуская газэта. — 1933. — № 1. — С. 1.
13. Да самаадукацыі // Беларуская газэта. — 1933. — № 1. — С. 1.
14. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). — Ф. 200. Воп. 2. Спр. 10.
15. Чарнякевіч, А. М. Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада 1919—1939 гг. / А. М. Чарнякевіч. — Гродна : Юрсапрынт, 2015. — 306 с.
16. Дэкларацыя групы поэтаў да ўсіх пісьменьнікаў Заходняе Беларусі // Літаратурная старонка. — 1934. — № 1. — С. 1—4.
17. Traczuk, J. Czasopiśmiennictwo białoruskie w II Rzeczypospolitej (1918—1939) / J. Traczuk — Siedlce : Wydawnictwo Uniwersytetu Przyrodniczo-Humanistycznego w Siedlcach, 2013. — 270 s.
18. Пестрак, П. Дарогаю жыцця / П. Пестрак // Полымя. — 1959. — № 12. — С. 135—151.
19. Echo "Hromady" przed sądem // Kurjer Wileński. — 1936. — Nr 83. — S. 6.
20. Piąty dzień procesu 16-tu komunistów // Dziennik Wileński. — 1936. — Nr 87. — S. 7.
21. LCVA. — F. 131, ap. 2, b. 3508.
22. Пестрак, П. Збор твораў. У 5-ці тамах / П. Пестрак. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. — Т. 5. — 302 с.
23. ДАГВ. — Ф. 55. Воп. 1. Спр. 303.

*Паступіў у рэдакцыю 23.10.2023.*